***М.В. Лапыр***
БГЭУ (Минск)

# ЛЕЎ САПЕГА –АДНА З САМЫХ КАЛАРЫТНЫХ АСОБ У ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

У свой час Вялікае Княства Літоўскае набыло ў сваі шэрагі дыпламата, дзяржаўнага, ваеннага і палітычнага дзеяча - Льва Іванавіча Сапегу, аднаго з самых знакамітых беларусаў.

Леў Сапега нарадзіўся ў радавым маёнтку Астроўна ў магнацкай сям'і, якая мела ўплывовыя свецкія сувязі. Малалетнім яго аддалі на выхаванне ў Нясвіжскі двор Мікалая Радзівіла Чорнага, які потым паслаў трынаццацігадовага юнака на вучобу ў Лейпцыгскі універсітэт. Пасля вяртання ў ВКЛ Сапега паступае на службу да каралеўскага двара караля польскага і вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя, якому вельмі спадабалася эрудыцыя і адукацыя хлопца.

У 1580 годзе Леў Сапега займае пасаду сакратара гаспадарскага, а ў 1581 пісара гаспадарскага ў Канцэлярыі ВКЛ. Таксама ў гэтым жа годзе ён выступіў галоўным ініцыятарам стварэння Трыбунала ВКЛ – вышэйшага апеляцыйнага суда ВКЛ, пастановы якога мелі сілу пастаноў сойма. Са згоды Жыгімонта Вазы Леў Сапега ўзначаліў працу над трэцяй рэдакцыяй Статута ВКЛ, выдатнага помніка юрыдычнай думкі, які быў надрукаваны ў 1588 за ўласны кошт Сапегі з напісанымі да яго дзвюма прадмовамі: адна — зварот да Жыгімонта Вазы, другая – зварот да грамадзян ВКЛ. Дзякуючы свайму аўтарытэту ў ВКЛ Леў Сапега пад канец варшаўскага пацыфікацыйнага сойму ў канцы красавіка 1589 года атрымаў пасаду канцлера Вялікага Княства Літоўскага, нягледзячы на разыходжанні поглядаў на палітыку з Жыгімонтам Вазай. Потым стаў таксама і ваяводам віленскім, а з 1625 адначасова і вялікім гетманам літоўскім.

Багацця Льва Сапегі дазваляла яму фінансаваць многія асветніцкія і палітычныя праэкты, у тым ліку вайну са Швецыяй за Інфлянты. Ён жа быў і адным з натхняльнікаў паходу на Маскву ў час Рускай смуты пачатку 17 ст.

На вяршыні дзяржаўнай улады Л. Сапега вызначыў і характар дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да царквы. Ён уяўляў прыклад справядлівасці і талерантнасці: аднолькава адносіўся да прадстаўнікоў розных канфесій. Сам з праваслаўя пераходзіў у пратэстантызм, а потым у каталіцкую веру. Л. Сапега вітаў ідэю уніі паміж каталіцкай і праваслаўнай цэрквамі ў ВКЛ, бо лічыў, што рэлігійнае адзінства спрыяла б умацаванню дзяржавы і пазбавіла б яе ад многіх унутраных канфліктаў.

Леў Сапега быў здольным і таленавітым дыпламатам. Аднак, не заўсёды была магчымасць вырашаць усе дыпламатычнымі сродкамі, таму прыхадзілася абараняць цэласнасць ВКЛ і на поле бою. Падчас дзейнасці канцлера на паўночна-заходніх, усходніх і паўднёвых рубяжах Рэчы Паспалітай праходзілі цяжкія ваенныя канфлікты. Ён сам шмат разоў ўдзельнічаў у баявых дзеяннях, ахвяраваў сваю маёмасць на ўтрыманне арміі ВКЛ - гусарскі полк, сабраны на яго сродкі, удзельнічаў у бітве пад Вялікімі Лукамі і пры аблозе Пскова. Узначальваў пасольства ВКЛ па працягу дзеяння Ям-Запольскага міру (1582), заключыў мірныя дагаворы з Фёдарам Іаанавічам і Барысам Гадуновым (1600). Акрамя ўсяго, Л. Сапега таксама быў буйным мецэнатам, які на свае сродкі будаваў уніяцкія і праваслаўныя цэрквы, касцелы, адкрываў шпіталі, школы. Леў Сапега меў у сваіх маёнках больш за 3 тысячы кніг, сярод якіх былі творы знакамітых для таго часу філосафаў, мысліцеляў. Багацейшы магнат ВКЛ, Сапега апекаваў над мастакамі і літаратарамі. Ён з’яўляецца заснавальнікам ружанскага архіву, а на схіле год працаваў над удасканаленнем Метрык Вялікага княства Літоўскага - архіва спраў дзяржаўнай улады за 1386-1551 гг., а таксама над захаваннем каштоўных актаў за перыяд свайго канцлерства.

Такім чынам, Леў Сапега з'яўляецца адной з самых каларытных асоб ў гісторыі Беларусі. За сваё жыцце ён умацаваў краіну, садзейнічаў узросту культурнага развіцця Беларусі праз будаўніцтва храмаў, школ, тэатраў, архіваў. Гэты дзеяч зрабіў многае для развіцця і ўмацавання сваёй краіны. Нешматлікія дзеячы могуць пахваліцца такімі дасягненнямі. Трэба адзначыць – без Льва Сапегі сучаснай Беларусі магло не існаваць.